# ПРАЎДА Мастоўская

**Калі вы жадаеце атрымліваць**
у далейшым наша выданне, калі ласка, дашліце sms з паведамленнем адраса, на які павінна прыходзіць **«Мастоўская праўда»** на нумар :
**+ 48 725 302378**

**№ 21-22 (68-69) 15 снежня 2008 года**


# «Народная воля» на Гродзеншчыне

**Толькі 500 асобнікаў аднаўленай у продажы праз "Белсаюздрук" газеты "Народная воля" трапіла ў шапікі Гродна. Для горада, насельніцтва якога перавышае 300 тысяч жыхароў, гэтай лічбы яўна недастаткова, але, як паведамілі ў дзяржаўнай установе, бліжэйшым часам падвышэнне накладу не прадбачыцца.**



У кожны газетны шапік Гродна трапіла прыкладна 5-6 нумароў "Народнай волі". Гродзенская вобласць атрымала наклад газэты, які склаў 1000 асобнікаў: з іх 500 засталося ў Гродна, а 500 распаўсюдзілася ў раённых цэнтрах. Калі улічыць, што насельніцтва Гродзеншчыны складае больш мільёна чалавек, дык атрымліваецца, што 1 асобнік газеты прызначаны для тысячы патэнцыйных чытачоў.

Як зазначылі ў гродзенскім аддзяленні Белсаюздруку, пакуль складана гаварыць аб попыце на газету, бо вынікі рэалізацыі будуць падведзеныя значна пазней - пасля 12 студзеня наступнага года.

Боек каля гродзенскіх шапікаў за "Народную волю" пакуль не назіраецца, як і не назіраецца самой газэты: наклад, па словах супрацоўнікаў, знік на працягу першага дня продажу.

**Радыё Рацыя**

## Мужчына задыхнуўся атрутным дымам

**26 га лістапада, у Мастах па вуліцы Сонечнай загарэўся дом, аб чым у Мастоўскае раённае аддзяленне па надзвычайных сітуацыях паведамілі па тэлефоне. Званок раздаўся якраз у абедзенны час. Але ж дзякуючы таму, што мастоўскія выратавальнікі аператыўна прыбылі па месцу здарэння, тлеўшая пасьцель не паспела моцна распаўсюдзіць агонь па хаце.**

Для тушэння пажару спатрэбілася толькі адна выратавальная машына.

Прычынай пажару стала неасцярожнае паленне ў пасцелі. На вялікі жаль, атрутнага дыму хапіла для таго, каб 30-гадовы аматар цыгарэт заснуў назаўжды.

**Віктар Сахарэўскі**

# Белорусы скупают валюту

**Чистый спрос (спрос за вычетом предложения) населения Беларуси на инвалюту в ноябре 2008 года составит не менее $300 млн против $100 млн в октябре. С конца октября и в течение ноября среднедневной чистый спрос на доллары со стороны физлиц превышает $15 млн. Об этом сообщил "Interfax. by" источник в госорганах со ссылкой на данные Нацбанка.**

До октября в стране наблюдалась обратная тенденция: население выступало чистым продавцом инвалюты. За 9 месяцев 2008 года чистая продажа инвалюты физлицами составила $754,8 млн против чистого спроса на $326,3 млн за аналогичный период 2007 года.

«Нацбанк, как и ранее, не намерен вводить какие-либо ограничения на валютном рынке для физлиц, хотя такие предложения уже звучали», - подчеркнул источник.

Он также заявил о продолжающемся росте спроса на инвалюту со стороны юрлиц. «Сейчас присутствует явная тенденция вывода валюты из Беларуси под любым предлогом. Это объясняется намерением такого рода игроков впоследствии заработать на спекулятивных сделках в расчете на девальвацию или «черный» рынок», - считает источник.

В Беларуси в январе-сентябре 2009 года в результате сделок во всех сегментах валютного рынка чистый спрос на инвалюту составил $1 млрд 47,9 млн, что в 11,5 раза больше по сравнению с аналогичным периодом 2007 года.

**Агенство финансовых новостей**

## АДНЫМ СКАЗАМ

Самы высокі ў гісторыі курс еўра ў адносінах да брытанскага фунта сцерлінгаў зафіксаваны 10 сьнежня - у ходзе таргоў у Лондане за адзін еўра давалі 0,8779 фунта, гэта з'яўляецца рэкордам з 1999 года, паведаміла агенства France Press.

Міністэрства замежных спраў Славаччыны асуджае арышты некаторых грамадзкіх актывістаў у Менску 10 сьнежня.

Як вынікае з сёньняшняй заявы славацкага зьнешнепалітычнага ведамства, такія захады ўскладняюць развіццё супрацоўніцтва паміж ЭЗ і Беларусьсю, паколькі не адпавядаюць міжнародным абавязаньням краіны, перадае Radio Slovakia International

У Беларусі за лістапад зарэгістравана 94 выпадкі бешэнства жывёлаў.

У наступным годзе цана газу для Беларусі мае скласці $240 за тысячу кубаметраў, піша залежная ад расійскага газавага манапаліста газета «Коммерсант».

Міністэрства эканомікі Беларусі прапануе працягнуць для ІП ільготны рэжым увозу тавараў з Расіі да 2010 года

Прэм'ер-міністр Канады Стывен Харпер наладжвае сувязь з апазіцыяй, каб перадухеліць уласную адстаўку з паста ў студзені 2009 г.

Паслугі ў беларускіх салярыях зараз могуць аказваць толькі медработнікі

У Горадні затрыманыя праваабаронцы

Віктар Сазонаў, Уладзімер Хільмановіч, Алег Калінкоў і Ян Роман раздавалі на вуліцах Горадні інфармацыйныя ўлёткі і сцыжкі да Дня абароны правоў чалавека. Іх затрымалі міліцыянты побач з паркам Жылібера.

На праваабаронцах былі белыя накідкі з надпісамі "60 год Усеагульнай дэкляраццы правоў чалавека". Акрамя гэтага, праваабаронцы расклейвалі плякаты з тэкстам гэтай Дэкляраці.

Сусветны банк пашырыць маштабы сваёй падтрымкі развіваючымся краінам, у тым ліку за кошт рэзэрваў на бліжэйшыя 3 гады новых крэдытных рэсурсаў МБРР аб'ёмам да $100 млрд., а таксама па лініі МФК, якая аказвае падтрымку прыватнаму сектару, праз механізмы фінансаваньня таргоўлі, рэкапіталізацыі банкаў і садзейнічання праэктам у вобласці інфраструктуры, якія фінансаваліся прыватным сектарам, які рызыкуе застацца ў бедным фінансавым сттановішчы. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прадстаўніцтве Сусветнага банка ў Беларусіз спасылкай на даклад "Глабальныя эканамічныя перспектывы - 2009".

Прэзыдэнтам Швайцарскай Канфедэрацыі на 2009 год абраны 66-гадовы Ханс-Рудольф Мерц (Радыкальна-дэмакратычная партыя Швайцарыі). Рашэнне аб гэтым прынята 10 га сьнежня падчас паседжання парламента краіны.

10 сьнежня тысячы людзей прынялі удзел у шэсцях у Афінах, пад час якіх патрабавалі павышэння заробкаў і дапамогі для малазабясьпечаных сем'яў ва ўмовах фінансавага крызіса.

Латвія плануе зачыніць частку сваіх замежных амбасадаў, паведамляе NovoNews з спасылкай на дзяржаўнага сакратара МЗС, былога амбасадара ў Расіі Андрыса Тейкманіса. З яго словаў, бюджэт зьнешнепалітычнага ведамства ў 2009 годзе плануецца скараціць на 15 % (прыкладна на 5,5 мільёна даляраў), у сувязі з чым "будзе зачынена даволі шмат амбасадаў ". Дыпламат не ўдакладніў у якіх латвійскія амбасады перастануць працаваць.

С 13 декабря команда БАТЭ ушла в отпуск, который продлится по 20 января 2009 года.

Команда соберется 21 января и проведет медобследование в Республиканском центре спортивной медицины, после которого отправится на клубную базу в Дудинку, где состоится стартовый этап подготовки к новому сезону. В планах тренерского штаба значатся два зарубежных сбора. Пока идет согласование вопросов об их местах и времени проведения, сообщает пресс-служба БАТЭ.

В будущем году команде не помогут Максим Жавнерчик, уже рассчитавшийся с клубом, Антон Сахаров, занимающийся вопросами дальнейшего трудоустройства, а также Владислав Мирчев и Иван Пеха, сроки аренды которых завершились

**Паводле БелаПАН, АФН, Наша Ніва**

## АПЫТАННЕ НАВЕДВАЛЬНІКАЎ САЙТА masty.belarda.org

Ці хацелі б вы ў будучым жыць у Мастах?




- Так. Мне падабаецца жыць у Мастах – **27.5%**
- Не. У Мастах я не бачу перспектываў для сябе – **41.2%**
- Хутчэй так, чым не – **9.8%**
- Хутчэй не, чым так – **19.6%**
- Цяжка зараз адказаць – **2.0%**

# Каложа: царкоўнікі супраць улады?

**Царкоўнікі жадаюць пераробкі праекта рэстаўрацыі царквы XII стагодзьдзя.**



Ці будуць у Каложы шанцы трапіць у сьпіс сусьветнай культурнай спадчыны ЮНЕСКО? Уладам гэтага вельмі хочацца, царкоўнікам гэта абыякава. Другіх не задавальняе папярэдняя праца архітэктараў і рэстаўратараў, словам —спэцыялістаў. Яны прагнуць, каб праект рэстаўрацыі быў разгледжаны Сінодам Беларускага экзархату Рускай праваслаўнай царквы. Улады, здаецца, завагаліся і гатовыя пайсьці на саступкі.

Навіна аб зацьверджаньні праекту рэстаўрацыі самага старажытнага храма Гарадзеншчыны была доўгачаканай. Прычым здавалася, што пастаўлена кропка ў спрэчках: адпаведна якому часу, стагодзьдзю аднаўляць сьвятыню? Прафэсыяналы аднязначна сказалі: на час перад разбурэньне царквы ў 1853 годзе, бо напярэдадні былі зроблены ўсе яе абмеры. Як выглядала яна пасьля пабудовы — у XII нікому невядома, не захавалася ніякіх дакумэнтаў, ніякіх малюнкаў. Паводле прынятых у сьвеце стандартаў, рэстаўрацыя будзе лічыцца навуковай толькі пры навуковым да яе падыходзе. Толькі ў гэтым разе можна спадзявацца, што ўдасца прапанаваць аб'ект для разгляду ЮНЕСКО.

Рэч у тым, што рэальна захавалася толькі палова царквы, таму ў любым разе яна будзе пасьля адновы ў пэўнай ступені будаўнічым муляжом. Аднак, калі пачаць выдумляць і аднавіць яе "на XII стагодзьдзе", то Каложа стане бадай самым сапраўдным муляжом. А менавіта гэтага дамагаюцца царкоўнікі. Чаму? Магчыма дзеля вонкавага выгляду, уяўнага прэстыжу: у Горадні зьявіцца прыгожанькі храм ажно XII-га стагодзьдзя, такіх старажытных быць ня можа сёньня ні ў Менску, ні ў Магілёве, напрыклад.

Сьвятары абгрунтоўваюць сваё права тым, што Каложа іхняя, яны праводзяць цяпер унутры набажэнствы і потым ёю таксама будуць валодаць. Але храм — гэта рэдкі помнік архітэктуры і належыць, уласна кажучы, усёй краіне, усім беларусам, ня кажучы пра гарадзенцаў. А тым часам сьпіс ЮНЕСКО, дарэчы, надзвычай прэстыжная рэч і вельмі жаданая для Беларусі мэта. Пакуль, як вядома, рэальна ў яго трапіў толькі Мірскі замак. Знаўцы з усьмешачкай падкрэсьліваюць: упалі на калені, уламалі каб уключылі яго, бо мэтады рэстаўрацыі не адпавядаюць ніякім замежным крытэрыям. Хто быў там, бачыў, што лесьвічныя маршы, перакрыцьці — сучасныя бэтонныя, хаця павінны быць з матэрыялаў, адпаведных стара-даўнім.

Карацей кажучы, для Мірскага замка ў ЮНЕСКО зрабілі выключэньне. Другі раз, для Каложы, яго рабіць ня стануць. Калі толькі царкоўнікам ня ўдасца перамагчы архітэктараў і рэстаўратараў, і аднаўленьне царквы адбудзецца згодна з навуковымі патрабаваньнямі. А пакуль у сярэдзіне сьнежня плануецца на нарадзе ў міністэрстве культуры разгледзець прапановы царкоўнікаў.

**Алесь Кавалёў, http://www.bulletinonline.org**

# Мілінкевіч: Хай Еўропа гаворыць адным голасам!

**Лідэр Руху "За Свабоду" Аляксандар Мілінкевіч заклікаў эўрапейскіх лідэраў выпрацаваць адзіную пазыцыю ў падыходзе да Беларусі. Беларускі палітык прымаў удзел у міжнароднай канфэрэнцыі „Салідарнасьць для будучыні", якая адбывалася ў польскім Гданьску з нагоды 25 гадавіны прызнаньня былому польскаму прэзыдэнту Леху Валэнсу Нобэлеўскай прэміі ў галіне міру.**

Аляксандар Мілінкевіч казаў, што апазыцыя ў Беларусі патрабуе падтрымкі.

А. Мілінкевіч: Я вельмі прашу, каб у Эўропе гаварылі адным галасам на тэму Беларусі. Я вельмі прашу палякаў, якія найбольш робяць, каб Беларусь была незалежнай і свабоднай, каб таксама сёньня й заўтра гаварылі адным голасам. Будзьма разам, за вашую й нашую свабоду!

Аляксандар Мілінкевіч нагадаў, што сёлета беларускія ўлады звольнілі зь вязьніцаў восем апазыцыйных дзеячоў. Таму варта, каб Эўропа заўважыла зьмены, якія адбываюцца ў Беларусі.

А. Мілінкевіч: У Беларусі напэўна адбываюцца зьмены, хоць некаторыя мяркуюць, што гэта толькі касмэтычныя зьмены. Заўсёды, калі мы гаворым пра Беларусь, трэба памятаць, што мы змагаемся ня толькі за свабоду, ня толькі за правы чалавека. Сёньня мы таксама змагаемся за незалежнасьць нашай краіны. Нам неабходная супраца з Эўразьвязам. Эўразьвяз зьяўляецца хіба адзінаю структураю, якая магла б дапамагчы зьмяніць у лепшы бок беларускую эканоміку.

Аляксандар Мілінкевіч прамаўляў падчас выступаў на тэму „Эўропа — крыніца стабільнасьці ці пагроза для мірнага разьвіцьця сьвету ў XXI стагодзьдзі".

**Польскае радыё**



# У браканьераў канфіскавалі 50 кг рыбы

**У затрыманых у Мастоўскім раёне браканьераў канфіскавана рыба агульнай вагой 50 кг, паведаміў карэспандэнту БЕЛТА начальнік Мастоўскай міжраённай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету Алег Серада.**

Па яго словах, парушальнікі - трое жыхароў вёскі Вярэйкі Валкавыскага раёна - арудавалі ў прызе ракі Нёман ля вёскі Дубна. У іхнія сеткі акрамя ляшчоў, плоткі, акунёў, гусцяры, галавача трапіла і адна асобіна падуста - вельмі рэдкай рыбы. занесенай у Чырвоную кнігу Беларусі. Страта склала Br6,4 млн.

Матэрыялы па факце браканьерства накіраваны ў следчыя органы Мастоўскага РАУС для ўзбуджэння крымінальнай справы. Як адзначылі спецыялісты, у прузе ля Дубна зараз багата рыбы, якая прыйшла туды на зімоўку. Гэты амаль паўкіламетровы ўчастак Нёмана ўпадабалі рыбаловы-парушальнікі. За апошнія два тыдні тут затрыманы дзве групы браканьераў.

**http://masty.belarda.org**

## Красное вино против старости

**Красное вино помогло ученым выяснить, как можно сопротивляться старости**

Как пишет журналист The New York Times Николас Уэйд, красное вино помогает сопротивляться старению. Речь идет о благотворном воздействии ресвератрола — вещества, которое в небольших количествах содержится в красном вине — на здоровье и продолжительность жизни лабораторных мышей.

Результаты исследования, осуществленного группой во главе с Дэвидом Синклером из Гарвардской школы медицины, опубликованы в среду на сайте журнала Cell. С возрастом целостность хромосом в организме нарушается, но ресвератрол оздоравливает их, активизируя белок сиртуин, поясняет журналист.

Биологи расширяют усилия по изучению сиртуинов и других мощно действующих веществ, которые контролируют "настройки" обмена веществ в живой клетке — например, обработку жиров и реакцию на инсулин, отмечает издание.

Компания Sirtris, одним из основателей которой является Синклер, разработала ряд препаратов, которые воздействуют подобно ресвератролу, пишет газета. По сообщению журнала Cell Metabolism в ноябре, один из этих препаратов предотвращает ожирение у мышей, питающихся жирной пищей, а также усиливает их выносливость к физическим нагрузкам — совсем как ресвератрол.

Впрочем, следует помнить, что ресвератрол — сильнодействующее вещество с разносторонним эффектом, который далеко не сводится к активизации сиртуина, подчеркивает автор.

"В обычных условиях сиртуин служит для блокирования всех генов, в которых клетка на данный момент не нуждается. Однако если в ДНК хромосомы рвутся обе нити, сиртуин скрепляет их вместе, и тогда гены, которые он блокировал, порождают хаос", — поясняет издание. По мнению Синклера и его соавторов, в этом, возможно, и состоит одна из основных причин старения у мышей и, вероятно, человека. В интервью газете ученый подчеркнул, что гипотеза еще не доказана. Тем не менее он утверждает, что уже пять лет ежедневно принимает ресвератрол крупными дозами и чувствует себя прекрасно.

**Николас Уэйд
The New York Times**

# У Брусэлю гнуткі інструмэнт

**Еўрасаюз відавочна аддае перавагу гнуткім інструментам. Раней гэта быў візавы бізун (спіс неўязных чыноўнікаў), але барацьбе з рэжымам ён дапамог як хваробе кашаль. Цяпер вось кіраўнік мінскага офіса Еўракамісіі сп. Хальцапфель кажа пра «гнуткі інструмент для дыялогу». Мы, маўляў, наўмысна не складалі дарожнае карты ці пакрокавай стратэгіі, каб мець абсяг для манеўру.**



Гаворка ідзе пра тэставы перыяд да 13 красавіка 2009 года, калі сыходзіць тэрмін замарозкі тых самых санкцый. За гэты час Мінск мусіць прадэманстраваць прагрэс у выкананні 12 сакральных умоў Бруселя. Аўтар, далібог, не ўпэўнены, што іх наўскідку згадае нават мэтр-палітолаг. А ўжо пра тое, каб рэжым іх выканаў, не мараць і самыя адпетыя ідэалісты. Гэты быў бы ўжо не той рэжым.

Карацей, будзем лічыць тыя 12 ўмоў нечым кшталту маральнага кодэксу будаўніка камунізму.

Але ж і рэальнага маршруту прагматычнага збліжэння на агляды перыяд — то бок дарожнай карты, пра каторую столькі казалі эксперты, — як высвятляецца, няма.

Еўропа дзьме на ваду. Яна ўжо апяклася на выбарах. Заходнікі дзяўблі: гэтая кампанія стане для беларускіх уладаў тэстам на жаданне... і г.д. У выніку атрымалі анучай па твары: «стэрыльная палата»! А ўжо ж узялі кірунак на нармалізацыю, і так неахвота зноў у акопы вайны з «апошняй дыктатурай»!

Давялося глытаць пілюлю.

І цяпер вось Еўрасаюз страхуецца гумавым паняткам «прагрэс».

Нашы бязмежна літасцівыя ўлады вярнулі ў распаўсюд два брэнды незалежнай прэсы. Нібыта прагрэс. Але ж яшчэ дзесяткі паўтара газет, выкінутых некалі з кіёскаў ды каталогаў, застаюцца за бортам. А новы закон аб СМІ? Паводле слоў еўрадэпутата Яцэка Пратасевіча, гэты медыйны закон — адзін з самых жорсткіх у Старым свеце. Калі ў лютым ён пачне дзейнічаць у цяперашнім драконаўскім варыянце, то у сферы СМІ атрымаецца класічнае: крок наперад, два крокі назад. А калі яшчэ адмысловай пастановай накінуць хамут на сеціўную вольніцу?

Такі ж супярэчлівы працэс можа быць і па іншых кірунках. Ну праўдуць нашы дзеячы на пару з АБСЕ нейкі семінар датычна ўдасканалення выбарчага заканадаўства. Вось, прыслухоўваемся, асэнсоўваем еўрапейскі досвед, але ж, шаноўныя паны, хутка толькі коткі пладзяцца!

Хаця на добры лад можна было б зрабіць эфектны крок. Не асуджаць апазіцыю на сізіфаву працу — збор 50 000 подпісаў дзеля ўнясення на разгляд заканадаўцаў праекта паправак ў Выбарчы кодэкс. Гэта ж самае — унесці дакумент у палату — мае права любы дэпутат. Вось і давядзіце, што палата не кішэнная!

Ці вось што тычыцца нармальных умоў для партый і трэцяга сектара. Тут мала не біць па галаве дручком. Мо перастанце адфутбольваць Мілінкевіча ці БХД — хай нарэшце зарэгіструюць свае структуры!

Карацей, менавіта зараз дарожная карта надта прыдалася б. Канечне, не трэба выстаўляць завоблачныя патрабаванні, бо тутэйшыя дзеячы з іх імпульсіўным норавам могуць даць такі «адказ Чэмберлену», што ўся разрадка напружанасці — сабаку пад хвост.

Але ціснуць варта гранічнай канкрэтыкай. Ну і на перніку, вядома, не забывацца.

Дарма думаць, што беларускаму начальству так ўжо хочацца зноў у акопы. Найхутчэй што яно, склаўшы ў куфар камуфляж, ужо замаўляе смокінгі дзеля свецкіх раўтаў у еўрапейскіх сталіцах. І па дробязях гатовае саступаць. Палітыка — мастацтва магчымага, і ў гэтым сэнсе логіка «гнуткіх інструментаў» зразумелая. Чакаць тут каляровай рэвалюцыі заходнія паліттэхнолагі замучыліся.

Галоўнае ж, бадай, на што разлічвае Захад: рэформы праз не хачу пачынаюцца тады, калі канчаюцца грошы. Што не зробяць 12 умоў, тое можа зрабіць сусветны крызіс.

А паводле Аляксіса Таквіля, «самы небяспечны момант для кепскага рэжыму — калі ён пачынае рэфармавацца».

Важна толькі, каб гульні між Мінскам і Бруселем не ператварыліся ў аналаг «саюзнага будаўніцтва». Што там будуюць і што не могуць падзяліць — перманентны рэбус для асаў аналітыкі.

Зразумела, у дачыненнях цяперашняга беларускага кіраўніцтва з ЕС ёсць далікатныя моманты, які да пары да часу лепей абмяркоўваць за дыпламатычнымі кулісамі. Але ж увогуле працэс нармалізацыі стасункаў па лініі Мінск — Брусель мусіць стаць болей празрыстым. Каб у часткі нашай дэмакратычнай супольнасці не было ўражання, што яе «прадынамілі».

**Аляксандр Класкоўскі, БелаПАН**

## Депозиты сократились и увеличились

**Депозиты населения в белорусских банках увеличились за ноябрь 2008 года на 0,4% и на 1 декабря составили Br13,309 трлн. в пересчете на нацвалюту (на 1 ноября объем вкладов составлял Br13,251 трлн). Об этом сообщили в Национальном банке Беларуси.**

Прим этом вклады в инвалюте за прошлый месяц увеличились 5,5% и на 1 декабря достигли $2,151 мрд в эквиваленте (против $2,039 на 1 ноября).

В то же время депозиты в белорусских рублях сократились на 2,9% и на 1 декабря составили Br8,672 трлн против Br8,930 трлн. на 1 ноября.

Таким образом, в ноябре текущего года наблюдалась тенденция противоположная предыдущему месяцу. Напомним, в октябре был зафиксирован рост вкладов населения в белорусских рублях (на 0,8%), и сокращение в иностранной валюте (на 3,3%). Как пояснили в Нацбанке, часть населения приняла решение поменять валюту своих сбережений из белорусских рублей в доллары.

Отметим также, что в ноябре зафиксирован общий приток вкладов, в то время как за октябрь отток составлял 0,45%.

В Нацбанке также сообщили, что на депозитах в белорусских банках хранится более Br133 мард (в пересчет на нацвалюту) средств нерезидентов, что составляет менее 1% от общего объема вкладов.

Там также проинформировали, что Национальный банк не намерен вводить ограничения по досрочному снятию денежных средств с вкладных счетов физических лиц.

**Агенство финансовых новостей**

# Сустрэчу Мілінкевіча ў Гродна не дазволілі

**Гарадзенскія ўлады забаранілі правядзенне сустрэчы лідэра незарэгістраванага руха "За свабоду" Аляксандра Мілінкевіча з жыхарамі горада 13 снежня бягучага года. Афіцыйная падстава – адсутнасць вольнага мейсца ў палацы культуры тэкстыльшчыкаў, дзе павінна было адбыцца мерапрыемства.**

Жыхары Гародні ў свой час не аднойчы звярталіся з прапановай да былога дэпутата гарсавета Сяргея Кузьмянка і іншых грамадскіх актывістаў з прапановай зарганізаваць сустрэчу з Аляксандрам Мілінкевічам . Вынікі парламенцкіх выбараў, грамадска-палітычнае жыццё краіны і сацыяльная неабароненасць насельніцтва-вось далёка не поўны спіс пытанняў, якія хвалююць жыхароў горада. Аднак намеснік старшыні гарвыканкама Ірына Сенчанкова пісьмова паведаміла арганізатарам сустрэчы аб немагчымасці яе правядзення ў сувязі з тым, што заяўленае памяшканне ў акрэслены час будзе занята планавымі мерапрыемствамі.

Па словах Аляксандра Мілінкевіча, захады мясцовых уладаў ніякім чынам не перашкодзяць правядзенню яго сустрэчы з гарадзенцамі.

Як сведчыць практыка, такая форма адмовы – для гарадзенскіх уладаў з'яўляецца традыцыйнай. Папярэднія спробы правесці афіцыйныя сустрэчы гарадзенцаў з былым кандыдатам у прэзідэнты мясцовыя ўлады таксама блакавалі, але мерапрыемствы праходзілі на вуліцы ў выглядзе несанкцыянаваных мітынгаў.

**Радыё Рацыя**

# Выйшаў том заходнебеларускага паэта

**Рух "За Свабоду" прадставіў новую – трэцюю па ліку кнігу з сэрыі "Гарадзенская бібліятэка" пад назвай "Небыцьця не існуе".**



Упершыню пад адной вокладкай сабраныя творы ў розных жанрах, якія належаць пяру Пятра Сеўрука. Ён жыў у Скідэлі, памёр на сухоты ў 24 гады, гэта здарылася ў 1929. Дасьледчыкі мяркуюць: каб ня сьмерць, яго амаль непазьбежна рэпрэсіравалі б пасьля прыходу ў Заходнюю Беларусь савецкай улады ў 1939 годзе.

Пятро Сяўрук кіраваў мясцовым Таварыствам беларускай школы, друкаваўся ў нацыянальных выданьнях. У прадмове да кнігі польскі дасьледчык – прафэсар Ежы Тамашэўскі з Варшаўскага унівэрсытэту з добрым веданьнем расстаўляе акцэнты, што датычаць і палітычнага жыцьця ў даваеннай Польшчы, і пагляду ў і пазыцыі Сеўрука.

У прыватнасьці, ён зазначае: "У сваіх артыкулах і дзёньніку ён адмяжоўваўся ад палітыкі, але, незалежна ад сваіх словаў, быў у яе ўплецены, неаднаразова змагаўся словам зь левымі радыкаламі, крытычна ацэньваў дзейнасьць камуністаў у Польшчы і іх экспэрымэнты ў СССР. Таксама і праца над пашырэньнем беларускай асьветы, і абарона роднай мовы атрымлівалі ў савецкіх і польскіх умовах палітычны характар, незалежна ад памкненьня вызваліць ТБШ ад палітычных уплываў, асабліва камуністычных, паколькі П.Сяўрук слушна бачыў у іх пагрозу для легальных беларускіх асьветніцкіх арганізацый".

Пры савецкай уладзе, у БССР, тыя дзеячы, хто ня быў зьнішчаны, вярнуліся з ГУЛАГу, яны сядзелі ціхенька, бо беларусам быць было небясьпечна.

http://www.bulletinonline.org

# Предприниматели прошли по Минску маршем

**15 декабря в Минске прошел Марш предпринимателей — акция протеста индивидуальных предпринимателей, выступающих против новых условий ведения бизнеса, которые должны вступить в силу с нового года.**







1 января прекращается действие пункта 3 указа № 285 «О некоторых мерах по регулированию предпринимательской деятельности», в соответствии с которым ИП — плательщики единого налога могут не предоставлять документы на ввезенный ими товар из России и уплачивают ввозной НДС в фиксированной сумме.

Около трех тысяч человек собралось на площадке у здания Академии наук, откуда предприниматели организованной колонной дошли до парка Дружбы народов.

В ходе короткого митинга были озвучены положения адресованной властям резолюции. Предприниматели предлагают назначить уполномоченного по вопросам малого и среднего бизнеса при президенте Беларуси, создать при Администрации президента комиссию из числа представителей предпринимательских структур для рассмотрения нынешнего положения ИП и выработки предложений по улучшению их работы, требуют сохранить прежние условия работы по ввозу товаров, отменить существующий порядок найма работников и разрешить нанимать до пяти работников без ограничения по родственному или другому признаку.

Наступная акцыя, сказаў А. Макаеў, калі патрабаванні не будуць задаволеныя, пройдзе 12 студзеня (панядзелак) на Кастрычніцкай плошчы беларускай сталіцы.Ближайшая акция, сказал А. Макаев, если требования предпринимателей не будут выполнены, пройдёт 12 января на Октябрьской площади в Минске.

**По материалам БелаПАН**

# Внешний долг Беларуси увеличился до $14,5 млрд

**Совокупный внешний долг Беларуси на 1 октября 2008 года составил $14557,0 млн, увеличившись с начала года на 16,5% или $2063,5 млн, сообщает Белстат. За третий квартал текущего года внешний долг увеличился на 3,1% или $441,4 млн, за второй квартал - на 3% или $415,7 млн, за первый квартал – на 9,7% или $1206,4 млн.**

Внешний долг органов государственного управления в январе-сентябре 2008 года увеличился на 5,3% до $2144,2 млн. Прямые инвестиции (межфирменное кредитование) увеличились за три квартала на 49,5% до $759,9 млн на 1 октября.

Внешняя задолженность коммерческих банков увеличилась с начала года на 21,4% до $ 3120,7 млн. Внешний долг прочих секторов экономики увеличился на 19,2% до $8081,6 млн на 1 октября 2008 года.

Внешний долг органов денежно-кредитного регулирования сократился на 24,4% и составил на 1 октября 2008 года $450,6 млн.

**АФН**

# Нидерландские политики требуют не выдавать визы белорусским чиновникам

**Крупнейшая партия правящей коалиции Нидерландов - Христианско-демократический призыв (ХДП) - потребовала в понедельник от правительства принять жесткие меры против Александра Лукашенко в связи с тем, что он препятствует поездке детей из пострадавших от аварии на Чернобыльской АЭС регионов на рождественские каникулы за рубеж, сообщило голландское радио.**

Парламентарии от ХДП Питер Омтзихт (Pieter Omtzigt) и (Maarten Haverkamp) в письме на имя министра иностранных дел Нидерландов Максима Ферхахена заявили о необходимости прекратить выдавать визы представителям белорусских властей и членам их семей. При этом члены голландского парламента отмечают, что, препятствуя отдыху за рубежом чернобыльских детей, сами правители Беларуси, их жены и дети часто ездят за ее пределы, в частности, на учебу. По мнению ХДП, запрет на выдачу виз представителям белорусских властей и членам их семей необходимо оформить в рамках Европейского союза.

Омтзихт еще в сентябре безуспешно пытался ликвидировать препятствия, чинимые Лукашенко для поездок "детей Чернобыля" на отдых в Нидерланды и другие страны. Голландский парламентарий занялся этим вопросом после того, как Лукашенко издал указ, в котором говорилось, что, по соображениям безопасности, белорусские дети не могут ездить на каникулы за рубеж. По мнению нидерландских политиков, на самом деле Лукашенко боится, что дети услышат много критики в адрес его режима, а некоторые из них решат остаться за рубежом. По словам Омзихта, поначалу, однако, казалось, что проблема с отдыхом белорусских детей в Нидерландах будет решена, но в конце концов Лукашенко ответил отказом.

"Уже более двадцати лет тысячи детей из пострадавших от аварии на Чернобыльской АЭС регионов ездили на отдых в Нидерланды. Они живут в голландских семьях, и о них всегда хорошо заботятся. Мы хотим, чтобы чернобыльские дети вновь получили возможность проводить каникулы за рубежом. Жители многих голландских городов готовы их принять и подарить им замечательные рождественские каникулы", - говорит Омтзихт.

**РИА "Новости"**

# Беларусбанк спыніў крэдытаванне набыцця жылля

**Найбуйнейшы беларускі банк ААТ «АСБ «Беларусбанк» 8 снежня спыніў крэдытаванне пакупкі жылля. Пра гэта агенцтву «Інтэрфакс-Захад» паведамілі ў банку.**

Зроблена гэта было пасля аналізу рынку крэдытавання жылля і яго аб'ёмаў.

Беларусбанк цяпер ажыццяўляе толькі крэдытаванне будаўніцтва жылля — для тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоваў(«чаргавікоў») у беларускіх рублях пад 15% гадавых тэрмінам на 15 год, і для тых, хто не мае патрэбы, пад 20% гадавых тэрмінам на 15 год.

Таксама Беларусбанк паведамляе пра зніжэнне на працэнтнай стаўкі на 5 працэнтных пунктаў пры датэрміновым пагашэнні фізічнымі асобамі крэдытаў на агульных падставах. Зроблена гэта, відаць, дзе таго, каб людзі хутчэй вярталі крэдыты.

### Ёсць «навіны» і ў іншых банкаў Беларусі

Дэльтабанк наогул прыпыніў выдачу крэдытаў ва ўсіх гандлёвых кропках, паведамляе infobank.by.

Беларускі Народны Банк выдае крэдыты толькі на спажывецкія патрэбы ў далярах тэрмінам на 3 гады ажно пад 22% гадавых.

Белінвестбанк мае чаргу на разгляд заявак 2-3 тыдні. Белзнешэканамбанк выдае крэдытныя карткі на 3 гады ў беларускіх рублях пад 24%, у валюце пад 23% з даведкай пра даходы.

А Прыёрбанк паведамляе, што спажывецкія крэдыты гатоўкай і на картку выдаюцца толькі ў валюце пад 15% да 2500 даляраў ЗША, у беларускіх рублях — выдаецца безнаяўны крэдыт на аплату тавараў у гандлёвых кропках пад 18%, зазначае infobank.by.

**nn.by**

## АНЕКДОТЫ

Разгар фінансавага крызісу. Мужчына падыходзіць да банкамату зняць грошы, а банкамат яму кажа: «Слухай, мужык, пазыч 50 даляраў да аўторка».

***

Тады, калі ўвесь свет церпіць ад глабальнага эканамічнага крызіса, у Мастах адкрыўся чарговы завод па вытворчасці медных тазікаў.

***

- Вось вам таблеткі.
- Я іх піць не буду.
- Чаму?
- У мяне ад вашых таблетак бальнічны хутка заканчваецца!

***

- Бэрымор, вы бачылі чалавека, які ўзяў маё паліто?
- Так, сэр!
- Як ён выглядаў, чорт пабяры?!
- Жахліва, сэр! Рукава былі яму надта кароткімі.

***

Пасля 2009 пытаньне ў дзяўчын пры знаёмстве будзе не: Кім ты працуеш і колькі зарабляеш, а: Ты працуеш?

***

Бландынка сяброўцы:
- Ён не любіць мяне, бье пастаянна!
- Муж?
- ТОК!!!!

***

Крызіс навучыць нас даверяць фінансавым установам. Зараз пры размяшчэнні дэпазіта кліенты будуць патрабаваць ад банкаў залог.

## АБ'ЯВА

# Адменены адзіны цягнік на Беласток

**З 14 снежня адмяняецца адзіны цягнік з Гродна на Беласток і адзін цягнік на Кузніцу.**

Цягнік да Беластока на 19.50 больш курсіраваць не будзе, як і рэйс на Кузніцу ў 14.50.

Пакуль ў польскім кірунку з Гродна можна даехаць трыма цягнікамі на дзень — у 5.35, 10.05 і 19.50.

**МАСТОЎСКАЯ ПРАЎДА**
Грамадска-інфармацыйнае выданне Мастоўшчыны
№ 21-22 (68-69) 15 снежня 2008 г.
**Заснавальнік: Аляксандр ЗАРЭМБЮК.**
***Дэпутат Мастоўскага райсавета 24 - га склікання***
Надрукавана на фінасавыя ахвяраванні жыхароў г. Масты ў друкарні ААТ Бліц-Прынт, г. Кіеў вул. Даўжэнка, 9.
Выходзіць 2 разы ў месяц.
**Распаўсюджваецца бясплатна.**
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць інфармацыі. Іх меркаванне можа не супадаць з пунктам гледжання рэдакцыі і не накладваюць на яе ніякіх абавязкаў.